Министерство культуры Республики Беларусь
Белорусский государственный университет культуры и искусств

# НАУЧНЫЙ ПОИСК В СФЕРЕ СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВА

*Материалы научной конференции
профессорско-преподавательского состава
Белорусского государственного университета культуры и искусств,
посвященной Году качества
(Минск, 21 ноября 2024 г.)*

Минск
БГУКИ
2025

УДК 316.7+7
ББК 7я431+85я431
Н 347

Редакционная коллегия:
*Н. В. Карчевская, Е. Е. Корсакова, Ю. Н. Галковская,*
*Е. В. Пагоцкая, Н. Е. Шелупенко*

Рецензенты:
*М. Л. Цыбульский,* кандидат искусствоведения, доцент,
*Е. В. Голикова-Пошка,* кандидат искусствоведения, доцент

**Научный поиск** в сфере современной культуры и искусства :
Н347 материалы науч. конф. профессорско-преподавательского состава БГУКИ, посвященной Году качества, Минск, 21 нояб. 2024 г. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2025. – 556 с.
ISBN 978-985-522-394-9.

Представлены материалы научной конференции профессорско-преподавательского состава, посвященной Году качества. Ее участники обсудили достижения за 25 лет существования белорусской культурологической школы и перспективы ее развития, рассмотрели опыт сохранения, трансляции, репрезентации историко-культурного наследия, информационные технологии в культуре, традиции и новации в межкультурной коммуникации и диалоге культур и многие другие вопросы.

Адресуется преподавателям учреждений образования сферы культуры, научным работникам, студентам, а также широкому кругу читателей.

**УДК 316.7+7**
**ББК 7я431+85я431**

**ISBN 978-985-522-394-9**

© Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», 2025

# СОДЕРЖАНИЕ

## ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

*Соколова О. М.* Культурологическая школа Беларуси: истоки, реалии, перспективы ........................................................ 9

*Николаева Ю. Г.* Жанровое разнообразие эстрадно-циркового искусства на белорусской эстраде советского периода ................. 18

## Круглый стол<br>Здабыткі і перспектывы развіцця<br>беларускай культуралагічнай школы:<br>да 25-годдзя заснавання

*Смолик А. И.* Аксиология как проблемное поле отечественной культурологии: становление и развитие .................................. 25

*Масленченко С. В.* Этапы развития цифровой культуры и ее цифровизации ........................................................................ 32

*Никонович Н. А.* Религиоведение и культурология как важнейшие составляющие гуманитарного знания .................................... 37

*Коваленя Е. Г.* Исследование геокультуры города как области научного знания в белорусской культурологии ......................... 41

*Усовская Э. А.* Культурология и культурные исследования как фундаментальное и прикладное направления ......................... 49

*Белакурскі В. М., Белакурская Ж. Я.* Феномен архетыпу ў філасофска-культуралагічным разуменні ..................................... 52

*Криштаносова Е. А.* Этнические традиции в контексте современного диалога культур: консервация и трансляция ...................... 56

*Сухоцкая Т. Ф.* Культуралагічнае асэнсаванне мастацкай літаратуры ........................................................................ 59

*Карнажицкая Т. В.* Гуманитарно-эстетический потенциал современного культурного пространства Беларуси ......................... 64

*Соколовская М. М.* Ценности традиционной китайской культуры .. 68

*Самосюк Н. В.* Социокультурные связи русской православной церкви и православной церкви Западной Беларуси в межвоенный период ........................................................................ 73

*Шелег Е. А.* Инклюзивное культуротворчество в информационной эпохе: возможности и вызовы ........................................ 77

*Михалёва Е. А.* Интерпретация понятия «традиционные семейные ценности» в социально-гуманитарном дискурсе ......................... 82

*Молдованова Е. С.* Междисциплинарный подход к изучению культуры детства ........................................................... 86

*Пилипенко К. А.* Специфика создания молодежных центров на базе креативных пространств …………………………………….. 91
*Ду Бикунь.* Традиции дворцовой системы питания в Китае ……… 94
*Кузьменчук И. В.* Особенности формирования национальной культуры в системе идентичности нации: культурологический аспект …... 100
*Ли Сюэсинь.* Коннотация образа яйца в восточных космогонических мифах ……………………………………………………… 104
*Лу Ся.* Бурлеск как жанр традиционных уличных представлений Сычуани ……………………………………………………………… 108
*Чжун Цяньцянь.* Влияние западной традиции на китайскую философию ……………………………………………………………… 113

## Секция 1
## Актуальные проблемы теории и истории искусства

*Пагоцкая Е. В.* Сценическое пространство Беларуси: историко-культурный аспект ………………………………………………… 119
*Шаройко Е. Н.* Фреска в художественном решении фильма …….. 124
*Петухова Н. В.* Метад рэканструкцыі ў распрацоўцы і ўвасабленні традыцыйнага абраду ……………………………………………... 129
*Стельмах А. М.* Современные стратегии позиционирования деятельности театра ………………………………………………….... 132
*Трапянок У. А.* Генезіс і сучаснае развіццё паэтычнага радыётэатра Беларусі ……………………………………………………….. 137
*Чжан Яньпен, Трепенок В. А.* Влияние заимствованных программ на современное телевидение Китая на примере постановочного проекта «Слава Богу, ты здесь» …………………………………….. 145
*Николаева Ю. Г.* Роль деятельности концертных бригад в развитии эстрадно-циркового искусства в Беларуси советского периода ... 149
*Грищенко А. Б.* Пленэры по живописи как способ сохранения и популяризации архитектурного наследия Беларуси ……………….. 156
*Коршук А. Н.* Музыкальное направление классический кроссовер в массовой культуре Беларуси и России: специфика и формы проявления ……………………………………………………………….. 161
*Беспалая А. А.* Арт-парк «Никола-Ленивец» как способ художественного освоения природного пространства …………………….. 165
*Гу Юйши.* Стилистические особенности жанра сяншэн ………….. 173
*Су Жунцзи.* Актуальные проблемы современного театрального образования (на примере подготовки актеров в Беларуси первой четверти XXI в.) ……………………………………………………… 177
*Сюй Цзинань.* Поэтичность в живописи Марка Шагала ………….. 181
*Чжан Цзыхань.* Развитие детского театра в Китае ……………….. 189
*Чэнь Вэнь Вэнь.* Современное состояние театрального любительского искусства в Беларуси ……………………………………….. 193

*Ян И.* Исследование выставок китайских музеев в условиях цифровизации ........................................................................ 197
*Смирнова И. А.* Национальные тенденции развития белорусского джаза первой четверти XXI в. ................................................ 201
*Бортновский В. В.* Выдающиеся личности в мировой истории дирижерского исполнительства: Густав Малер (1860–1911) ............ 208
*Федоров А. В.* Искусство дирижирования как самостоятельный вид музыкального творчества ................................................ 212
*Довжик Е. Н.* Формирование современного духового оркестра в зарубежной музыкальной культуре XX в. ................................ 219
*Сергеева О. О.* Творческий портрет Анри Брода и его вклад в развитие французской исполнительской школы игры на гобое ........... 225
*Поляков Г. Г.* Сценическая интерпретация электронной танцевальной музыки: определение и содержание понятия .................. 229
*Пуш С. В.* Формирование исполнительских навыков в классе струнного ансамбля ........................................................ 234
*Белан А. И.* Специфика формирования знаний, умений и навыков эстрадно-джазовой манеры исполнительства (в контексте истории традиционного и прогрессивного современного сольного исполнительства пианистов) ........................................................ 240
*Домненкова Л. В.* Формообразование и декорирование европейского фаянса и фарфора эпохи барокко ................................... 247
*Кривошеева С. В.* Тенденции развития народного изобразительного искусства в современном художественном пространстве Беларуси ........................................................................ 253
*Мицкевич А. Г.* Из опыта исследований и презентаций многообъектных произведений искусства ...................................... 257
*Васюк Т. І.* Мастацтва як форма ўдасканалення асобы ............... 261
*Шатило Е. В.* Особенности экспонирования декоративно-прикладного искусства в контексте современной выставочной деятельности ........................................................................ 266
*Лінькова Н. А.* Рэпрэзентацыя каштоўнасцей традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў сучаснай выставачнай прасторы ... 271
*Ван Юекай.* Влияние маньчжурских мифов о сотворении мира на искусство масок ........................................................ 276
*Ши Сюефэн.* Искусство традиционной китайской керамической посуды ........................................................................ 281
*Ши Сюефэн.* Мебельное искусство традиционного китайского дома ........................................................................ 284
*Дожина Н. И.* Специфика организации аудиторной работы по сольфеджио со студентами факультета музыкального и хореографического искусства ........................................................ 287
*Ухова И. В.* Жанровые средства музыкальной выразительности: научный и педагогический аспекты ........................................ 292

*Ходинская Н. Н.* Звуковой материал музыки XX–XXI вв. в курсе современной гармонии ........................................................ 297
*Лойко О. Б.* Содержательно-методические аспекты преподавания дисциплины «Элементарная теория музыки» для иностранных студентов ........................................................................... 303
*Чжан Цзобинь.* Музыкальное образование Китая до 1911 г.: историко-теоретический аспект ............................................. 308
*Кожемяко Д. А.* Слово как нетипичный компонент хореографического произведения ........................................................ 312
*Бодунова И. И.* Старинные бальные танцы: исторический и современный аспекты ........................................................ 320
*Ковальчик И. В.* Развитие белорусской народно-сценической хореографии периода «нулевых» ........................................... 325
*Навроцкая О. А.* Антуражная хореография Беларуси: характеристика развития на современном этапе ..................................... 330
*Столяр О. Н.* Актуальные методические рекомендации при проведении занятий по дисциплине «Европейская и латиноамериканская программа» ............................................................ 334
*Фань Чжунтао.* Применение повседневных артефактов как сценического реквизита в искусстве китайского танца ...................... 338
*Гажевская-Пешак Т. С.* Пейзажная лирика в хоровом творчестве Н. Литвина (на примере хорового цикла «Родныя вобразы») ........... 342
*Войтик С. Ф.* Локальные типы многоголосия в традиционной песенной культуре Понемонья .............................................. 348
*Волынец Е. Н.* Современные формы популяризации гармони в музыкальной культуре Беларуси ........................................... 354
*Баранова Н. В.* Некоторые аспекты развития музыкально-образного мышления у студентов хоровой специализации посредством фортепианных переложений оперно-симфонической музыки ......... 359

## Секция 2
## Историко-культурное наследие: опыт сохранения, трансляции и репрезентации

*Бамбешка І. І.* Мемарыялізацыя асобы музейнымі сродкамі: да пытання аб фарміраванні тэрміна «мемарыяльны музей» ............ 364
*Зимина М. В.* Понятие превентивной консервации в современной музеологии ............................................................................ 370
*Наумова Е. Г.* Технологии искусственного интеллекта как инструмент сохранения историко-культурного наследия Беларуси ...... 374
*Ли Пэн.* Трансляция традиционной китайской медицины в мировое пространство ............................................................... 382

## Секция 3
## Информационные технологии в культуре: новации и перспективы развития

*Жилинская Т. С., Якимович В. С.* Геймификация обучения: сущностные характеристики и специфика ее реализации при подготовке менеджеров-культурологов …………………………………………… 387
*Жилинская Т. С., Бачурина Т. В., Кунцевич О. М.* Цифровая культура как драйвер трансформации личности ………………………... 393
*Федосова А. А.* Стратегия цифрового продвижения учреждения культуры как инструмент планирования рекламной деятельности … 398
*Руткевич С. А.* Искусственный интеллект в искусстве: основные тенденции развития и перспективы дальнейшего применения ……... 404
*Гончарик Н. Г., Серегина Л. А.* Особенности современных цветовых пространств и технологий мониторов ………………………. 408
*Бовбель Е. В.* Исследование феномена послушания и ответственности с помощью анализа больших данных сферы культуры ……… 414

## Секция 4
## Межкультурные коммуникации и диалог культур: традиции и новации

*Макаревич А. В.* Тренд в пространстве социокультурной коммуникации: трактовка понятия и проблема идентификации ………... 419
*Шаймерденова С. К.* Всемирные игры кочевников – международный символ дружбы и культурного обмена …………………………... 423
*Кузнецова Е. В.* Культурный код: определение и особенности проявления в современном рекламном дискурсе …………………….. 429
*Смоликова Т. М.* Инновационные подходы к рекламным коммуникациям на основе AI-технологий ……………………………… 435
*Лебедева Д. В.* Стереотипы и предрассудки в межкультурной коммуникации …………………………………………………………... 442
*Рунцо Д. В.* Корпоративная культура и межкультурные коммуникации: нравственно-этические проблемы …………………………….. 448

## Секция 5
## Библиотечно-информационная деятельность в системе культурно-образовательного потенциала социума

*Галковская Ю. Н.* Актуальные проблемы совершенствования содержания библиотечно-информационного образования ………….. 452
*Зыгмантович С. В.* Формирование профессиональных компетенций будущих библиотечных специалистов для реализации социально-культурных функций ……………………………………… 459
*Козленко Е. Ю.* Понимание студентами сущности и возможностей профилизации «Аналитика» ……………………………………… 466

*Политевич Е. Э.* Создание и распространение профессионального цифрового библиотечного медиаконтента ........................ 471
*Гладырева Н. А.* Применение технологии проблемного обучения для развития критического мышления студентов при обеспечении медиабезопасного поведения в информационном пространстве ....... 478
*Ткаченко А. С.* Активное чтение как нестандартный способ прочтения художественной литературы ........................................... 483

## Секция 6
## Педагогика социально-культурной деятельности: современные формы и пути развития

*Шелупенко Н. Е., Шаколо А. В.* Патриотизм как детерминанта развития национального культурного пространства Беларуси ......... 491
*Ушакова В. М.* Основные аспекты развития инновационной педагогики на современном этапе ........................................... 496
*Казлоўская Л. І.* Сучасныя падыходы да класіфікацыі культурна-дасугавых праграм ........................................................ 503
*Самерсова Н. В.* Теоретико-практические основы педагогического моделирования социально-культурной деятельности детей и молодежи ............................................................ 508
*Цыркун Н. А.* Стихотерапия как метод развития творческих способностей и научного мышления специалистов сферы культуры ... 512
*Цыркун И. И.* Психологический анализ представлений слушателей ИПКиПК об учителе начальных классов и о специалисте сферы культуры ........................................................ 517

## Секция 7
## Белорусская и зарубежная филология: особенности и инновационные формы изучения в учреждениях высшего образования сферы культуры и искусства

*Пісарэнка А. М.* Тыпалогія вобразаў і вобразнасці мастацкага тэксту (да юбілею паэта Міколы Шабовіча) ............................ 523
*Клімаў І. П.* Тэматыка і кампазіцыя прадмовы Сымона Буднага да Нясвіжскага катэхізіса 1562 г. .......................................... 529
*Тычына С. М.* Тыпалогія вобраза героя «свой сярод чужых, чужы сярод сваіх» у рамантычнай літаратуры XIX ст. і сучаснай літаратурнай казцы (на прыкладзе творчасці Д. Ф. Купера і Д. Роўлінг) .... 535
*Безмен С. Г.* Использование технологии «warming up» при обучении английскому языку студентов неязыкового вуза .................. 542
*Влазнюк Н. И.* К вопросу об определении понятия «мир музыки» ... 547
*Попова Д. Б.* Эссе как способ реализации письменно-коммуникативной компетенции в контексте иноязычного профориентированного обучения ........................................................ 550

# СЕКЦИЯ 7

# БЕЛОРУССКАЯ И ЗАРУБЕЖНАЯ ФИЛОЛОГИЯ: ОСОБЕННОСТИ И ИННОВАЦИОННЫЕ ФОРМЫ ИЗУЧЕНИЯ В УЧРЕЖДЕНИЯХ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВА

УДК 82-3:81'38/'42(476)

***А. М. Пісарэнка,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ТЫПАЛОГІЯ ВОБРАЗАЎ І ВОБРАЗНАСЦІ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ (ДА ЮБІЛЕЮ ПАЭТА МІКОЛЫ ШАБОВІЧА)

**Анатацыя.** Разглядаюцца экспрэсіўныя, у тым ліку вобразныя, сродкі мовы, характэрныя паэтычнаму ідыястылю аўтара. Яны не толькі ўзбагачаюць змест, дапамагаюць вылучыць галоўную думку – ідэю, спасцігнуць яе глыбіню, але і надаюць радкам спецыфічнае, мілагучнае гучанне. Адзначаецца, што асноўнымі рысамі ідыястылю Міколы Шабовіча з’яўляюцца неалагізмы, а таксама эпітэты, метафары, параўнанні, перыфразы, прыёмы паранiмii і паранамазіі і такія стылістычныя фігуры, як антытэза, анафара, эліпс, умаўчанне. Фактычны матэрыял сведчыць, што вобраз аўтара актуалізуецца на ўсіх маўленчых узроўнях яго вершаванай мовы.

**Ключавыя словы:** тыпалогія, вобраз аўтара, маўленчы ўзровень, неалагізм, паранамазія, паранімія, вобразныя сродкі, тропы, эпітэт, метафара, параўнанне, перыфраза, стылістычныя прыёмы, антытэза, анафара, эліпс, умаўчанне.

***A. Pisarenka,***
*PhD in Philology, Associate Professor, Head of the Department of the Belarusian and Foreign Philology of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# TYPOLOGY OF IMAGES AND IMAGINATION OF ARTISTIC TEXT (TO THE ANNIVERSARY OF THE POET MYKOLA SHABOVICH)

**Abstract.** The article examines the expressive, including figurative, linguistic devices characteristic of the author's poetic idiostyle. They not only enrich the content, help highlight the main idea and grasp its depth, but also imbue the lines with a distinctive, melodic quality. It is noted that the main features of Mykola Shabovych's idiostyle are neologisms, as well as epithets, metaphors, similes, periphrases, the use of paronymy and paronomasia, and stylistic figures such as antithesis, anaphora, ellipsis, and omission. The evidence demonstrates the actualization of the author's image at all levels of his poetic language.

**Keywords:** typology, image of the author, speech level, neologism, paranomasia, paronymy, figurative means, tropes, epithet, metaphor, simile, paraphrase, stylistic devices, antithesis, anaphora, ellipsis, silence.

Мова мастацкіх твораў уяўляе сістэму, у межах якой вылучаюцца падсістэмы розных маўленчых узроўняў. Праблема лінгвастылістыкі – выяўленне і апісанне тропаў, экспрэсіўных адзінак, а таксама інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту – набывае ў філалагічнай навуцы асабліва важнае значэнне. Менавіта мова мастацкага стылю захоўвае моўную норму, узбагачае слоўны запас і маўленне асобы ў цэлым, а сам літаратурны твор праз вобразы садзейнічае выхаванню ў студэнцкай моладзі самых найлепшых якасцей – павагі да старэйшых, любові да радзімы, вернасці ў сяброўстве і каханні, адказнасці за свае ўчынкі, захаванне сямейных традыцый і інш. У сваю чаргу тыпалогія як метад навуковага пазнання накіравана на раздзяленне сукупнасці аб’ектаў, а затым іх аб’яднанне ў некаторую ўпарадкаваную групу. Вядома, што якраз «асэнсаванне мастацкага твора адбываецца па меншай меры ў тры этапы: сінтэз – аналіз – сінтэз-2, гэта азначае якасна новы сінтэз, больш высокага парадку, які ўяўляе глыбіннае асэнсаванне твора» [2, с. 14]. З вышэйадзначанага вынікаюць такія характарыстыкі мастацкіх вобразаў, як чляненне/падзельнасць у межах іх характарыстык на

розных маўленчых узроўнях. Аднак поўнае ўяўленне пра мастацкі вобраз можа быць пасля сінтэзу-2: аб'яднання вынайдзеных характарыстык у адну цэлую сістэму. Самі ж вобразы, іх віды, змест і структура, а значыць, і тыпалогія, шырока даследаваны, у прыватнасці, у літаратуразнаўстве. Так, С. В. Шамякіна ў прадметнай класіфікацыі літаратурных вобразаў вылучае наступныя: адушаўлёныя (вобраз-персанаж, вобраз лірычнага героя, вобразы аўтара і чытача, вобразы жывёльныя і раслінныя, вобраз народа), прасторавыя (вобраз-пейзаж, вобраз-локус, вобраз-топас), вобразы рэчыўнага свету (вобраз-рэч, вобраз-інтэр'ер, вобраз-экстэр'ер), поліпрадметныя вобразы (вобраз краіны, вобраз свету, карціна свету як вобраз другаснай рэальнасці) [3, с. 5–14]. Прыведзеная класіфікацыя вызначаецца грунтоўнасцю, усебаковым аналізам мастацкіх вобразаў, упарадкавае тэрміналогію дадзенага навуковага кірунку. Што да паэзіі Міколы Шабовіча, то даследаваны матэрыял сведчыць: асаблівую цікавасць выклікае менавіта вобраз аўтара, сутнасць якога, калі разглядаць у шырокім значэнні тэрміна, блізкая да паняцця «ідыястыль», хаця і, безумоўна, не тоесная да яго. Вобраз аўтара – складаная шматузроўневая структура, у межах аналізуемага тэксту/тэкстаў характарызуецца тымі самымі якасцямі, што і аналізуемы твор/творы [1, с. 56].

Паэтычны свет Міколы Шабовіча сумны і ў той самы час светлы, самотны, і ўсё ж такі напоўнены сустрэчамі, ціхі і, акрамя таго, поўны дыялогаў, разважанняў, прызнанняў. У асобе гэтага аўтара злучыліся і мовазнаўца, і паэт, што з'яўляецца рэдкай з'явай, паколькі навуковая дакладнасць замінае паэтычным крылам лётаць высока, лунаць на ветразях слова ў зорных і сонечных нябёсах. Аднак Міколу Шабовічу ўдалося размежаваць гэтыя віды творчасці і пакінуць даволі разнастайную спадчыну як паэтычную, так і лінгвістычную.

Кожны моўны ўзровень яго паэтычных твораў вызначаецца спецыфічнымі з'явамі, арыгінальнымі, адметнымі, праз якія раскрываецца яго філалагічны густ, маўленчае наватарства. Асаблівай выразнасцю валодаюць яго ***аказіянальныя неалагізмы***, дарэчы, даследчыкам якіх ён быў у мовазнаўстве. Гэты факт пацвярджае думку аб тым, што Мікола Віктаравіч і тэарэтык, і практык адначасова. Пацвердзім дадзены тэзіс адпаведнымі прыкладамі: *Дзе сны* ***сузорацца*** *мае; Як* ***кветавір*** *і ў вэ-*

*люме язмін; І я малюся на бялюткі ліст, / Нібы на луг* ***мядова-траваросны****; Яшчэ стуманеных дарог /* ***Малітварука*** *слухаць споведзь; Нема бярозы стаяць* ***шматрукія****; І не складаць ніко-му* ***хлусняспеў****; Мае* ***ласкава-сумныя*** *радкі, / Народжаныя сумнымі начамі; І нашы мары і гады / Плывуць удалеч,* ***ціха-плынна****; І піць пачуццяў* ***ціхаспеў****; Здарэнне! / На вуліцы Эннай апоўначы / Адбылося* ***сэрцатрасенне****; Як* ***зорнаспеўна*** *ў вышы-ні!* Кожны слоўны наватвор валодае празрыстай семантыкай і мілагучнасцю: паэт выказвае праз аказіяналізмы і любоў да мовы, і да свету, які адлюстроўваецца ў маўленні.

Мілагучнасць паэтычнага слова паэта праяўляецца праз сугучча слоў як роднасных, так і тых, якія выпадкова сустрэліся ў спеўным радку прааналізаваных тэкстаў: ***Апоўначы поўня****, / А можа,* ***апоўдні*** */ Ласкавае сонца / Душу мне* ***напоўняць****, / І думка праравецца / Радком невядомым, / І стане на сэрцы / Так лёгка, / Як дома; Калі вяртаецца* ***нядзеля****, / Тады збываецца* ***надзея****. / Яна, збываецца* ***не дзеля****…; Будзе* ***млосна*** *і будзе* ***мілосна****; – Я сам сабе магілу* ***вырыю****, / Калі сыны мае* ***адвернуцца****… / І страшна мне, што раптам з* ***выраю*** */ Пад стрэхі ластаўкі не* ***вернуцца****; Боль мой* ***востры*** *– / Мой* ***востраў****…; А ці* ***запоўніў*** *дзень я чым? / І ці* ***запомніў****?; Адно свае не горбіць плечы / І не зняверыцца абы. / А час журбы –* ***недаўгавечны****, / Такі* ***нявечны*** *час журбы;* ***Студзень*** */ Ужо* ***не астудзіць*** */ Тых слоў, / Што мы заўтра / Прамовім прад вечнасцю.*

Вядома, што аўтар – паэт-песеннік, магчыма, таму сугучныя словы нібы гуляюць у рэха: кожнае наступнае слова сваім гукавым складам паўтарае слова папярэдняе ў большай ці меншай ступені; гэтае слоўнае рэха нагадвае пераклічку гукаў, якая ўзмацняе экспрэсіўнасць сэнсаў, забяспечвае мелодыку радка. На такіх гукапаўторах у суседніх словах з рознай семантыкай заснаваны прыём ***паранімії*** (калі «перагукваюцца» словы аднакаранёвыя) і ***паранамазіі*** (сугучныя словы няроднасныя і, акрамя таго, розныя па сэнсе).

Незвычайная крылатая ***метафара*** ў Міколы Шабовіча, паколькі думка, каб утварыўся дадзены троп, павінна паляцець ад аднаго прадмета (у шырокім значэнні слова) да другога, параўнаць/супаставіць, вынайсці агульнае і перайменаваць прадметы, але так, каб гэтая іншасказальнасць не заблытала чытача, а здзівіла адкрыццём новага ў працэсе пазнання, уразіла, акры-

ліла: *Там, за нябачнаю імглой, / Дзе* ***зорак прадзіва****; І піць* ***пачуццяў ціхаспеў****, / Бы ў смагу, росамі; Што было ў чароўным маі, / Калі* ***спеўна звінела лісце****; Трывожыць і мяне /* ***Мінулага лістота****; Між намі* ***снегапад*** */ Мяцеліць* ***успамінна****; Над табой* ***ясназорыцца*** *неба, /* ***Ружавее*** *твая* ***маладосць****; На* ***скрыжаванні сэрцаў*** *і* ***дарог****; Зялёны* ***май гамоніць за акном****, /* ***На павуцінках жмурыцца світанне****; І ў думках* ***цалаваў*** *ужо нясмела /* ***Мелодыю вачэй****; Даруйце* ***слёзы пані Восені****, /* ***Яна саромеецца слёз****; Золкі* ***вецер блукае па росах****; Хай* ***спеў лунае ў вышыні*** */ Дзвюх* ***душ чуллівых****; Калі свой* ***баль спраўляе завіруха****; Мяне абдымеш ты за плечы / І* ***дзён*** *спаволіш* ***лістапад…****; Рукі твае* ***адгорнуць фіранку ў заўтрашні дзень***.

Лексічны ўзровень вызначаецца багаццем тропаў індывідуальна-аўтарскага характару: прычым, пра што б ні казаў паэт, слова яго меладычнае, менавіта спеўнае, пяшчотнае, поўнае шчырых пачуццяў. Прадуктыўныя вобразныя сродкі, якія падкрэсліваюць адметнасць ідыястылю аўтара, гэта – **эпітэт**: *А* ***вусны*** *твае і цяпер – /* ***Набраклыя мядовым дажджом****; Не вярнуць наноў /* ***Трапяткое лета****; Дзе надзей* ***гулказвонная плынь****;* ***Цемназорныя вочы*** *твае; Зноў на* ***ноце глухой*** *зрываюся; У летні* ***вечар*** *не знікай, /* ***Тужліваспеўны****;* ***Пяшчотны дожджык басаногі****;* ***Світанак песенна-шпачыны****; Тут спазнаў я крыніц* ***люстраводную плынь****;* **параўнанне**: *Маленечкае* ***дрэўца-немаўлятка****, /* ***Як птушаня пужлівае****, яно / хістаецца і хіліцца да маткі; А* ***ты пралескай першаю цвіцеш****, / Хоць да вясны яшчэ далекавата; У небе зорак – не злічыць, /* ***Люстэркам – поўня****;* ***Нібыта зорачкі ўначы****, / Так Вашы* ***вочы паглядзелі****;* ***Бялюткай чайкаю*** *з нябёс /* ***Ты прыляцела****, бы знароку; Мне* ***белы ліст – як светлы ўспамін****; Будзем да вечара /* ***Радасць у нашых далонях*** */* ***Несці*** *насустрач адно аднаму*, ***як малітву***; *І*, *можа быць*, ***пяшчоты дні***, / ***Нібыта птушкі ўвесну***, *вернуцца*; **перафраза***:* ***Горад позні – шматколерны птах. Гмахаў прадзіва; Успаміны – застылая пожня; Мой Нарачанскі край – калыска дабрыні; Гарэза-ноч – найлепшая радня*** *– / Жадае нам прыемнага світання…; мне лёсам ты пасланая, магчыма, /* ***мая царэўна, дзён маіх вясна***.

Сінтаксіс сваёй упарадкаванасцю, паслядоўнасцю кампанентаў у розных канструкцыях ці пропускам іх, незавершанасцю думкі ці інш. стварае сваю сістэму вобразных сродкаў, адцяняе

сэнсы. Адным з самых ужывальных прыёмаў паэтычнага радка М. Шабовіча з'яўляецца **антытэза**, з дапамогай якой дэманструецца ўнутраны канфлікт, нібы ў супярэчлівыя адносіны ўступаюць думкі і пачуцці; увесь свет і Сусвет падзяліўся на «мінусы» і «плюсы» / *І хочацца ад болю* ***ўсміхнуцца****, / І хочацца ад болю* ***застагнаць****; І* ***лёгка жыць*** *пад зорападамі, / І* ***цяжка жыць****; Хопіць часу нам з табой на* ***расстанні і сустрэчы****; Хацела зорачка* ***заззяць – і дагарэла***. У гэтай супрацьлегласці, у гэтай кантраснай зменлівасці, у гэтым супрацьстаянні – *сэнс усяго існага: не можа вечна ісці дождж, а вясёлка нібы мост ад яго да сонца.*

Тое, што сінтаксіс вершаванай мовы М. Шабовіча вызначаецца разнастайнасцю стылістычных прыёмаў, бачыцца нам натуральным, паколькі песеннасць, напеўнасць радка, структурная гармонія ўласцівыя жанру песні. Прадуктыўная таксама **фігура кальца**, калі верш пачынаецца і завяршаецца тым самым сказам: *Пакуль не позна – расчыняйце вокны; Вёсачка вілейская Шыпкі; Далёкі водсвет Вашага акна / І праз гады, як калісь, прада мною;* **анафара**: ***Яшчэ*** *квітнее збажына****, / Яшчэ*** *жытнёвы спее колас, /* ***Яшчэ*** *з табой нам давідна / Пяшчотназвонкі голас;* ***Мы*** [журавы] *па песні і па вясну. /* ***Мы*** *па свята зрунелых ніў, /* ***Мы*** *па рэк малады разліў...; І сорамна мне стане на хвіліну, /* ***Што*** *так не часта дома я гасціў, /* ***Што*** *роднай маме, мілай і адзінай, / Нямнога ўсё-ткі вершаў прысвяціў*; **эліпс**: *Благое пройдзе спакваля, / А добрае – не за гарою; І хоць між намі – ростані сцяна, / Жыву і сёння мараю адною; Адзвінела птушынае лета*, / *І над намі – мяцеліць палын*; **умаўчанне**: *Ад мітусні і ад пустых размоў / Вяртаюся, вяртаюся дамоў*...; ... *І гэтак хочацца споведзі, / Што першай сустрэчнай бярозінцы / Гатовы чытаць аповесці;* ... *А ўсё ж цікава; / чаму / Дата апошняга верша часцей і часцей супадае / З тым днём, / Калі быў я дома*; І ўсё / *зрабіць што покуль не паспеў*... / *О, дай мне сілы, Божа літасцівы*!...; *І слова тое не сказалася*, / *Якое песціў, ды забыў*...; ... *Вярнуцца б у лета, чароўнае*; *Як ціха струменіць лета*... Відавочна, што кожнае шматкроп'е падказвае чытачу штораз новую думку, адпаведную зместу і настрою самога паэта / лірычнага героя ці, наадварот, выклікае адметны, арыгінальны ўспамін. У любым выпадку недаказ

не бессэнсоўны, гэта маўленчая паўза «іграе» сэнсамі; лучае (*праменіць*) эмоцыямі.

У кожным новым вершы – новая паэтава эмоцыя, паэт прызнаецца: *Баюся перапеву са старым, / Напісаным даўно і перажытым. / А час ідзе – і нельга жыць былым, / А новае – хаваецца за жытам* (трэба ісці наперад, сеяць, гадаваць, а там і жыта ўзыдзе, там будучыня, там працяг).

Такім чынам, адметнасцю паэтычнага ідыястылю аўтара з’яўляюцца лексемы-аказіяналізмы, індывідуальна-аўтарскія вобразныя сродкі – тропы і фігуры, змест якіх дэманструе ўнікальнасць аўтарскага словаўжывання. У сваю чаргу вобраз аўтара з прааналізаваных прадуктыўных адзінак і зместу вершаў бачыцца нам сумным, самотным, адданым паэзіі, Радзіме, улюбёным у жыццё.

1. *Багамолава, А. М.* Стылістыка і культура беларускага маўлення : падручнік / А. М. Багамолава. – Мінск : РІВШ, 2023. – 392 с.

2. *Сырица, Г. С.* Филологический анализ художественного текста : учеб. пособие / Г. С. Сырица. – 3-е изд., стер. – М. : Флинта: Наука, 2015. – 344 с.

3. *Шамякина, С. В.* Предметная классификация литературных художественных образов / С. В. Шамякина // Журн. Белорус. гос. ун-та. Филология. – 2022. – № 2. – С. 5–16.

УДК 27-28+27-284

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ТЭМАТЫКА І КАМПАЗІЦЫЯ ПРАДМОВЫ СЫМОНА БУДНАГА ДА НЯСВІЖСКАГА КАТЭХІЗІСА 1562 г.

**Анатацыя.** Пераказваецца змест прадмовы і разглядаецца яе кампазіцыя. Твор складаецца з чатырох няроўных частак і залучае шмат біблейных цытат і перафразаў сюжэтаў Апостала, якім даецца сімвалічна-вобразная інтэрпрэтацыя. Сымон Будны звяртаецца да апостальскіх часоў і практык ранняй царквы і як пратэстант крытыкуе сучаснае яму грамадства, у якім пануюць традыцыйныя цэрквы. У творы адметны палемізм і апалагетызм, што тыпова для рэлігійнай літаратуры.